# EUROMOOT’S PRAYER




**Добры Ойча, Крыніца жыцця**, Ты любіш усіх сваіх дзяцей і ведаеш імя кожнага з іх, адкрый нашыя сэрцы на незвычайнае братэрства, праз якое Ты паклікаў нас служыць адзін аднаму. Няхай наш рух і праект Еўрамут, да якога мы рыхтуемся, будуць мірным і прамяністым знакам гэтага братэрства для свету.

**Пане Езу, Валадар супакою**, Ты клічаш кожнага з нас пайсці за Табою і ўбачыць, дзе Ты жывеш, каб мы маглі жыць у Тваёй прысутнасці. Дай нам ласку пакінуць свае выгоды і свае ўпэўненасці, адкрый нам скарбы Свайго сэрца і запалі ў нас Твой агонь цярплівай і даверлівай любові на працягу ўсяго часу падрыхтоўкі да Еўрамут.

**Дух Святы, Ойча бедных,** беражы нас ад усяго, што можа раздзяліць або перашкодзіць нам ісці за Хрыстом у нашай працы. Ты – сіла і лагоднасць, Ты злучаеш усіх людзей у радасці камуніі, будзь асновай нашай еднасці, кіруючай сілай нашай працы, каб яна прыносіла плён на Божую славу.

**Божая Маці,** каранаваная зоркамі, маліся за нас і вядзі нас!

Амэн